**4.** Запоўніце ў сшытку табліцу «Падзеі Французскай рэвалюцыі».

| Падзея | Дата | Вынікі |
|---|---|---|
| | | |

**5.** Растлумачце, што такое якабінская дыктатура. Выкарыстайце для адказу матэрыял параграфа.
**6.** Як вы думаеце, якія мерапрыемствы якабінцаў выклікалі незадаволенасць народа? Пацвердзіце сваё меркаванне фактамі.
**7.** Падрыхтуйце прэзентацыю па тэме «Французская рэвалюцыя XVIII ст.». Складзіце ў сшытку план вашага выступлення. Падбярыце ілюстрацыі па тэме.
**8.** Ахарактарызуйце Французскую рэвалюцыю, выкарыстоўваючы памятку 2 (с. 221).

## § 17. Паўднёвыя і заходнія славяне

1526 г. — 1569 г. — 1618–1620 гг. — 1620 г. — 1681 г.

**Успомніце.** *Якім было становішча Чэхіі ў складзе Свяшчэннай Рымскай імперыі? Якія наступствы для паўднёвых славян мела заваяванне туркамі-асманамі Балканскага паўвострава?*

У XVI–XVIII стст. паўднёвыя і заходнія славяне перажывалі адзін з найбольш складаных перыядаў сваёй гісторыі. Паўднёвыя славяне апынуліся пад уладай турэцкіх заваёўнікаў. Чэхія і Славакія належалі аўстрыйскім Габсбургам. Толькі Польшча ў складзе Рэчы Паспалітай да канца XVIII ст. заставалася незалежнай дзяржавай.

**Вы даведаецеся.** *Якім было становішча заходніх і паўднёвых славян у складзе іншых дзяржаў. У чым выявіўся рост нацыянальнай самасвядомасці славянскіх народаў.*

**1. Чэхія.** У 1526 г. Чэхія перайшла пад уладу Габсбургаў. З таго часу на чэшскіх землях пачаўся ўціск пратэстантаў. У рэшце рэшт гэта пры-

вяло да антыгабсбургскага паўстання (1618—1620) і Трыццацігадовай вайны. Паўстанне скончылася разгромам чэшскіх сіл у бітве ля Белай Гары ў 1620 г. і аднаўленнем улады Габсбургаў. Чэхі вымушаныя былі прыняць каталіцтва.

Пачаўся прыток нямецкага насельніцтва, якое актыўна засяляла чэшскія землі. Нямецкая мова пачала выцясняць чэшскую з дзяржаўных устаноў. Ішоў працэс анямечвання чэшскай знаці і значнай часткі гарадскога насельніцтва. У XVIII ст. у ходзе цэнтралізацыі імперыі Габсбургаў у Чэхіі, як і ў іншых абласцях дзяржавы, знішчаліся органы саслоўнага прадстаўніцтва.

У такіх умовах лепшыя прадстаўнікі чэшскай культуры, патрыёты, выступілі ў абарону чэшскай мовы. Іх называлі «будзіцелі» — літаральна «тыя, хто абуджае». У сваіх працах яны праслаўлялі Яна Гуса і іншых герояў нацыянальнай гісторыі, выступалі за адраджэнне чэшскай мовы. На гэтым этапе чэшскія патрыёты не змагаліся за незалежнасць сваёй краіны, іх дзейнасць насіла хутчэй асветніцкі характар.

**2. Славакія.** Славацкія землі здаўна знаходзіліся ў складзе Венгерскага каралеўства. Аднак у 1526 г. венгерскія войскі пацярпелі паражэнне ад туркаў-асманаў у бітве пры Мохачы. У выніку адбыўся



Султан Сулейман I Пышны ў бітве пры Мохачы (фрагмент). Турэцкая мініяцюра XVI ст.

падзел Венгрыі на тры часткі. Славакія апынулася ў складзе так званай Каралеўскай Венгрыі, якая неўзабаве стала часткай аўстрыйскай дзяржавы. Да канца XVII ст. славацкія землі былі арэнай супрацьстаяння Асманаў і Габсбургаў. Бесперапынныя ваенныя дзеянні тармазілі эканамічнае развіццё краіны. Славакія перастала быць палітычным і культурным цэнтрам Венгрыі.

У гэты час на культурнае развіццё Славакіі аказвалі ўплыў ідэі Рэфармацыі. Яны садзейнічалі пашырэнню чэшскай мовы. Ужо ў другой палове XVI ст. з'явілася кнігадрукаванне. У 1581 г. выйшла першая славацкая кніга на чэшскай мове са славацкімі рысамі — «Малы Катэхізіс» Марціна Лютэра. У гэты ж час увайшла ва ўжытак назва «Славакія».

**3. Польская дзяржава ў XVI–XVIII стст.** Доўгі час Польшча з'яўлялася адной з найбуйнейшых дзяржаў Еўропы. У адрозненне ад іншых еўрапейскіх краін, яна не ператварылася ў абсалютысцкую дзяржаву, а заставалася манархіяй са слабай каралеўскай уладай. Яе справядліва называлі шляхецкай рэспублікай, бо дваранства валодала выключнымі правамі ў кіраванні краінай. Буйны́ феадалы (магнаты) і шляхта карысталіся вялікімі прывілеямі, яны нават караля маглі абіраць па сваім меркаванні. Шляхецкія групоўкі часта вялі барацьбу за ўладу, што прыводзіла да феадальнай анархіі і паслаблення дзяржавы.



Падзел «польскага пірага». Карыкатура XVIII ст.

*Растлумачце назву карыкатуры.*

У ***1569 г.*** Польшча і Вялікае Княства Літоўскае стварылі аб'яднаную дзяржаву — Рэч Паспалітую — шматнацыянальную дзяржаву, у склад якой уваходзілі беларускія, польскія, літоўскія і ўкраінскія землі. У XVII ст. у Рэчы Паспалітай нарасталі рэлігій-

ныя, міжнацыянальныя і сацыяльныя супярэчнасці. У выніку вайны Расіі і Рэчы Паспалітай у 1654—1667 гг. да Расіі адышлі землі Левабярэжнай Украіны.

З пачатку XVII ст. Рэч Паспалітая стала весці больш актыўную знешнюю палітыку. Краіна пастаянна ўступала ў спусташальныя войны з Расіяй, Швецыяй і Асманскай імперыяй. Удзел у Паўночнай вайне ў 1700—1721 гг. прывёў да таго, што тэрыторыя Рэчы Паспалітай ператварылася ў арэну баявых дзеянняў. Даводзіліся да галечы сяляне і шляхта, расло незадавальненне польскім каралём, краіна прыходзіла ў заняпад.

1772 г.
Першы падзел
Рэчы Паспалітай
паміж Прусіяй,
Расіяй і Аўстрыяй

1793 г.
Другі падзел
Рэчы Паспалітай паміж
Прусіяй і Расіяй

1795 г.
’ рэці падзел
Рэчы Паспалітай
паміж Прусіяй,
Расіяй і Аўстрыяй

Падзелы Рэчы Паспалітай

Да паслаблення дзяржавы прыводзіў таксама прынцып «свабоднага вета» (лац. *liberum veto*), які дазваляў любому дэпутату сейма сваім пратэстам прыпыніць працу або адмяніць пастанову гэтага саслоўна-прадстаўнічага органа Рэчы Паспалітай. Дадзены шляхецкі прывілей перашкаджаў рэформам, вёў да адставання краіны ў цэлым.

Заняпадам Рэчы Паспалітай скарысталіся яе больш магутныя суседзі. У канцы XVIII ст. Аўстрыя, Прусія і Расія падзялілі яе землі паміж сабой.

**4. Паўднёвыя славяне пад уладай Турцыі.** На мяжы Сярэднявечча і Новага часу паўднёваславянскія землі падвергліся нашэсцю Асманскай імперыі — найбуйнейшай і магутнай дзяржавы таго часу. У канцы XIV ст. туркі ўварваліся ў Балгарыю, што стала канцом яе незалежнасці як самастойнай дзяржавы. У наступным стагоддзі яны падпарадкавалі сваёй уладзе Сербію, а пазней — амаль усе паўднёваславянскія землі (Боснію і Герцагавіну, частку Харватыі, Чарнагорыю).

Заваёўнікі разбурылі і зачынілі дзясяткі манастыроў і тысячы цэркваў. Многія храмы былі перароблены ў мячэці. Туркі-асманы прымусова перасялялі славян на іншыя тэрыторыі, прадавалі ў рабства,

сялілі ў турэцкіх гарадах. Многія славяне прымалі іслам, бо туркі абкладалі мусульман меншымі падаткамі.

Тым не менш большасць паўднёвых славян захавалі родную мову, веру і традыцыі. Станоўчую ролю пры гэтым адыграла праваслаўнае духавенства і манастыры. Непасільныя падаткі і рэлігійны прыгнёт выклікалі частыя антытурэцкія выступленні. Распаўсюджанай формай супраціўлення было гайдуцтва. Гайдукамі называлі ўзброеных паўстанцаў, якія змагаліся супраць чужаземнага прыгнёту. Аднак асманскія ўлады бязлітасна распраўляліся з паўстанцамі.

У складзе Асманскай імперыі балгарам забаранялі будаваць цэрквы, вышэйшыя за кончык шаблі, узнятай вершнікам. Каб не гнявіць туркаў-мусульман, але захаваць нармальныя памеры храма, частку будынка размяшчалі пад зямлёй.



Царква Святой Багародзіцы ў Сазопалі (Балгарыя). XVII ст.

У другой палове XVIII ст. на паўднёваславянскіх землях пачаўся перыяд нацыянальнага адраджэння. Шырокае распаўсюджанне атрымалі ідэі Асветніцтва. Славянскія асветнікі выказвалі вялікую цікавасць да свайго гістарычнага мінулага, абрадаў, фальклору. Яны імкнуліся павысіць узровень пісьменнасці і адукаванасці простых людзей. Дзейнасць асветнікаў спрыяла росту нацыянальнай самасвядомасці паўднёваславянскіх народаў.

**5. Паўднёвыя славяне пад уладай Аўстрыі.** Некаторыя паўднёваславянскія землі (Славонія, Славенія, частка Харватыі) знаходзіліся пад уладай Габсбургаў. Тут становішча славянскага насельніцтва было крыху лепшым, чым на тэрыторыі, якая ўваходзіла ў склад Асманскай імперыі. Аўстрыя выкарыстоўвала славянскае насельніцтва для барацьбы з турэцкім прасоўваннем у глыб Балкан. Мясцовыя жыхары атрымлівалі за службу дзялянкі зямлі і першапачаткова карысталіся




Землі заходніх і паўднёвых славян у сярэдзіне XVII ст.

*Вызначце, у склад якіх дзяржаў уваходзілі землі паўднёвых славян у XVI ст.*

правам унутранага самакіравання. Гэтая мера спрыяла паспяховым ваенным дзеянням аўстрыйскіх войскаў супраць туркаў.

Аднак з XVII ст. Габсбургі пачалі праводзіць палітыку цэнтралізацыі, што прывяло да значнага абмежавання правоў мясцовых феадалаў.

Пад уздзеяннем рэфармацыйных ідэй дзяржаўнай мовай была абвешчана нямецкая. Уводзілася свабода веравызнання, што змяніла

*Вызначце станоўчыя і адмоўныя бакі палітыкі аўстрыйскіх улад у дачыненні да паўднёваславянскіх народаў. Растлумачце свой пункт гледжання.*

становішча каталіцкай царквы. Асабліва моцным рэфармацыйны рух быў у Славеніі. Ён паспрыяў росту нацыянальнай самасвядомасці і фарміраванню нацыянальнай мовы.

*Такім чынам, да канца XVIII ст. усе паўднёвыя і заходнія славяне апынуліся пад чужаземным панаваннем. Але яны захавалі сваю мову і культуру, і гэта стала асновай барацьбы за нацыянальную незалежнасць у наступным стагоддзі.*

***Ключавыя словы:*** *«будзіцелі», Рэч Паспалітая, гайдукі.*

**Пытанні і заданні**

1. Прыдумайце свае назвы пунктам параграфа. Складзіце ў сшытку яго разгорнуты план.
2. У чым выявілася складанасць становішча славацкіх зямель у складзе Венгерскага каралеўства?
3. Якім чынам ідэі Рэфармацыі паўплывалі на развіццё культуры Славакіі?
4. Пацвердзіце гістарычнымі фактамі, што польская дзяржава была шляхецкай рэспублікай.
5. Пры дапамозе тэксту параграфа вызначце прычыны аслаблення Рэчы Паспалітай і яе падзелаў.
6. Якім чынам ідэі Асветніцтва паўплывалі на развіццё нацыянальнай культуры паўднёваславянскіх народаў?